# ТВАЕ СЫНЫ, ХОЦІМШЧЫНА

**( Працяг. Пач. у № 55, 59, 65 ,68).**

**Аляксандр Васільевіч Вечар** закончыў Хоцімскую СШ №1 у 1966 годзе. У 1982 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук. Тэма дысертацыі: "Павышэнне стойкасці стальных крысталізатараў паўбесперапыннага ліцця наплаўкай меднымі сплавамі".

**Чэпелеў Мікалай Іосіфавіч**, выпускнік СШ №1 1969 г., у 1974 годзе закончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ, закончыў аспірантуру, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Палітэхнічнай акадэміі ў Мінску.

**Дзмітрачкоў П.** , прафесар, дэкан гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова.

**Чапёлкін М.А.** , выкладчык Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.

**Піўчанка Пётр Рыгоравіч**, анатам, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар, нарадзіўся 2 студзеня 1947 года ў г.п. Хоцімску ў сям'і зубнога ўрача. Закончыў Хоцімскую сярэднюю школу з "Залатым медалём" у 1965 г., служыў у Савецкай Арміі ў 1966-1968г.г. У 1986 г. паступіў ў Ленінградзе ў Ваеннамедыцынскую ордэна Леніна Чырвонасцяжную акадэмію імя С.М. Кірава і ў 1970 г. пераведзен на лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута, які закончыў з адзнакай у 1974 годзе. Аспірант кафедры нармальнай анатоміі Мінскага медыцынскага інстытута ў 1974-1977 г., асістэнт кафедры 1977-1982г.г. У 1978г. прысуджана вучоная ступень кандыдата медыцынскіх навук, у 1982 г. зацверджан у вучоным званні дацэнта. Дацэнт кафедры нармальнай анатоміі ў 1982-1994г.г. Прарэктар Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута па міжнародных сувязях. У 1993 г. прысуджана вучоная ступень доктара медыцынскіх навук. Рашэннем Атэстацыйнай калегіі ад 29 сакавіка 1996 года Піўчанку П.Р. прысвоена вучонае званне прафесара па кафедры анатоміі чалавека. З 1995 года – дэкан медыцынскага факультэта замежных студэнтаў.

Навуковыя погляды і асноўныя накірункі дзейнасці сфарміраваліся пад уплывам акадэміка Д.М. Голуба і прафесара П.І. Лабко. Займаўся даследваннем хромафіннай тканкі (параганглііеў) у саставе вегетатыўных нервовых спляценняў брушной поласці ў чалавека, упершыню мар-

тамаў, гісталагаў і эмбрыёлагаў у 1981г.,І і 2-х рэспубліканскіх з'ездаў марфолагаў у 1986 і 1991 гадах. Удзельнічаў у міжнародных навуковых з'ездах і канферэнцыях у Балгарыі, Польшчы, ГДР, для навуковага удасканальвання камандзіраваўся ў Германію ў 1994, у Індыю –1996, у Іран – 1998 гадах.

З 1991 года-- намеснік старшыні праўлення Беларускага навуковага грамадства анатамаў, гісталагаў і эмбрыёлагаў. Член экспертнага савета па медыцыне, і Вышэйшага Атэстацыйнага камітэта пры кабінеце Міністраў РБ па прысваенню вучоных ступеняў з 1994 года.Навуковы кіраўнік студэнцкага навуковага грамадства Мінскага медыцынскага інстытута, член савета па абароне доктарскіх дысертацый.

Узнагароджан Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Казахскай ССР, Ганаровай Граматай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1996г.) за вялікі ўклад у падрыхтоўку урачэбных кадраў, развіццё медыцынскай навукі і ў сувязі з 75-годдзем з дня заснавання Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ (1994г.), узнагароджан нагрудным знакам Н.І. Пірагова і многімі іншымі ўзнагародамі.

**Чубакоў Пётр Міхайлавіч** , дацэнт Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута.

**Гарбачова (Лупікава) Клаўдзія Апанасаўна**, дацэнт Мінскага медыцынскага інстытута.

**Хенкін Б.Я.**, выпускнік 1940 года, акадэмік Новасібірскай АН.

**Падабед Іван Міхайлавіч** нарадзіўся 20 снежня 1922 года ў вёсцы Ельня Хоцімскага раёна. Пасля заканчэння Горнапрамысловага вучылішча працаваў электраслесарам, электраманцёрам на шахце ім. Кірава, рудніку Галубоўка Луганскай вобласці. У верасні 1941 года быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Пасля заканчэння палкавой школы, у

прастанароднага жыцця. Рукапісы аповесцяў "Няўдашачка Анюта" (!887г.), "Старая вёска", "Юда" !1899г.), камедыі "Бяда цыгана" (1905г.), рамана "Сярод балот і лясоў" (1913-1916г.) і інш. захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва Беларусі. У творах Брайцава адлюстравана сацыяльная несправядлівасць, цяжкае жыццё пры паншчыне, барацьба з прыгнятальнікамі, а ў рамане "Сярод балот і лясоў" расказваецца аб жыцці вёсак Хоцімшчыны і м. Хоцімск, апісваюцца падзеі ў гады першай рускай рэвалюцыі 1905 – 1907г.г.

**Зарыцкі Аляксей Аляксандравіч** нарадзіўся 9(22) сакавіка 1911 года ў м. Хоцімск, памёр 29 кастрычніка 1987 года. У вершы "Лепшая вуліца" пісаў:

"Нарадзіўся я ў Хоцімску,-  
Колісь глуш-глухамань,  
За барамі дрымучымі,  
За гаямі далёкімі,-  
Лесуны ў навакольных пушчах галёкалі  
Ад нудоты і ноч, і дзень.  
Барабанаўка – вулка,  
Дзе былінкаю з зерня  
Я ўзышоў на суровай няшчодрай зямлі,  
Была с пакон веку ў Смаленскай губерні,  
А суседнія вулкі ўжо Магілёўскай былі.  
Белая Русь так блізка – блізка,  
І вялікая тут – не чужыная – чужой.  
Над самай-самай мяжой  
Калыхалася мерна калыска:  
То з Расіі ды ў Беларусь,  
То ў Расію ды з Беларусі.  
Змалку лёг я на правільны курс  
І з яго не саб'юся.  
Барабанаўка – лепшая вуліца!  
Будзеш ты да магілы мне помніцца.  
Да цябе і дагэтуль душа мая туліцца,  
Маё сэрца дзядоўскае горнецца".

Беларускі савецкі паэт. Закончыў

года" (1961), аповесць Г. Зегерс "Чалавек і яго імя" і інш.

**Пётр Фёдаравіч Прыходзька** нарадзіўся 25 лютага 1920 года ў вёсцы Альшоў. Закончыў Магілёўскую газетную партыйную школу ў 1938 годзе-- вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у 1956 годзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1940 –1954 гадах – у Савецкай Арміі. З 1954 года працаваў у рэдакцыях часопіса "Беларусь", газет "Звязда", "Літаратура і мастацтва", на Мінскай студыі навукова - папулярных і хроніка – дакументальных фільмаў. З 1967 года працуе ў выдавецтве "Беларусь", у 1972 – 1980 гадах – у выдавецтве "Мастацкая літаратура". Друкуецца з 1936 года. Аўтар зборнікаў вершаў і паэм: "Голас сэрца" (1947), "Салдаты міру" (1951), "Цёплы каравай" (1960), "Вішнёвы агонь" (1963), "Сонца раней узышло" (1967), "На пераправе" (1974), "Плацдарм" (1978), "Абпаленыя вёрсты" (1986), "Водгулле грому" (1989).

Літаратурная прэмія імя А. Куляшова 1985 года прысуджана за зборнік "Парог памяці" (1983).

Асноўная тэматыка яго твораў – подзвіг савецкіх людзей у барацьбе з фашызмам, працоўныя будні, мірныя справы савецкага народа. У музеі захоўваюцца зборнікі вершаў з аўтографамі паэта, рукапісы яго паэм "Дар князёўны", "Золак над Бесяддзю" і інш.

Больш дзесяці зборнікаў вершаў выдаў наш зямляк паэт **Міхаіл Фядотавіч Карпенка.** Нарадзіўся у 1932 годзе ў вёсцы Максімаўка. Да пачатку вайны закончыў два класы Чарняўскай сямігадовай школы. У 1948 годзе закончыў Новамосінскую сямігадовую школу і паступіў у Гродзенскае культасветвучылішча. Пасля заканчэння працаваў дырэктарам Хоцімскага раённага Дома культуры. У 1952 годзе запрасілі на работу ў абласную газету "Магілёўская праўда" літсупрацоўнікам. У 1953 годзе быў пераведзен літаратурным кан-



**Піўчанка П.Р.**



**Я.Р. Брайцаў.**

Першыя вершы М.Ф. Карпенкі былі надрукаваны ў Хоцімскай раённай газеце.

У музеі афармлен альбом аб народным паэце Беларусі Аркадзю Куляшове, чый лёс цесна звязан з Хоцімшчынай.

Леанід Фёдаравіч Яўменаў пада-

